УДК 101:796.032:341.1-057.177.1“1972/80”

**_У.П. Люкевіч_**
*канд. філас. навук, дац., дац. каф. спартыўных дысцыплін і методык іх выкладання*
*Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А.С. Пушкіна*
e-mail: lucul@brsu.brest.by

# КРЫЗІС ФІЛАСОФІІ АЛІМПІЗМУ Ў ПЕРЫЯД 1972–1980 гг.: ПРЭЗІДЭНТ МАК МАЙКЛ МОРЫС ЛОРД КІЛАНІН ЯК АБАРОНЦА ІДЭАЛАЎ СПОРТУ

*Спартыўны рух, які ўвасоблены ў спаборніцтвах Алімпійскіх гульняў, адназначна можа быць інтэрпрэтаваны на падставе філасофіі жыцця, што ў дадзеным кантэксце вызначаецца як алімпізм. Фундаментальныя прынцыпы алімпізму маюць непасрэдныя адносіны да этычнай праблематыкі. Філасофія жыцця ў трактоўцы алімпізму вялікую ўвагу надае маральным пастулатам, якія распаўсюджваюцца на кожную чалавечую асобу. Развіццё і распаўсюджванне алімпійскага руху ў другой палове XX стагоддзя неаднаразова ўваходзіла ў супярэчнасці з разнастайнымі сацыяльна-палітычнымі акалічнасцямі. Нягледзячы на тое, што кіраўніцтва Міжнароднага алімпійскага камітэта ўсяляк падкрэслівала сваю недатычнасць да палітычных уплываў, яму неаднаразова прыходзілася прымаць адпаведныя рашэнні, каб аслабіць міжнародную напружанасць. Падставы філасофіі алімпізму былі падвергнуты выпрабаванню на іх трываласць. Ідэя алімпійскага спорту з неабходнасцю стала сам-насам з такімі сацыяльнымі з’явамі, як апартэід, тэрарызм і байкот. Сусветнае супольніцтва стала выразна падзяляцца на два канфрантацыйныя блокі. Неадназначнасць становішча ў яго тагачасным выглядзе неабходна было прывесці да адпаведнай суцэльнасці згодна з палажэннямі Алімпійскай хартыі. Гэты працэс адбываўся на фоне татальнага супрацьборства паміж дзвюма наймацнейшымі супердзяржавамі – СССР і ЗША.*

## Уводзіны

Алімпійская філасофія, альбо, як яе звычайна называюць, алімпізм, базіруецца на ідэях, якія былі выпрацаваны ў культуры Старажытнай Грэцыі, а потым увасобіліся ў творчай канцэпцыі П’ера дэ Кубертэна як аснова правядзення Алімпійскіх гульняў з мэтай садзейнічання чалавечаму развіццю. Алімпізм перад усім уключае ў свой змест такія вызначальныя аспекты, як удасканаленне асобы, адукацыю праз пасрэдніцтва спорту, культурны абмен, масавы ўдзел у спаборніцтвах, паняцце сумленнай гульні, міжнароднае ўзаемапаразуменне. Разам з тым неадназначнае стаўленне да спорту выявілася ў такіх знакамітых філосафаў XX ст., як Тэадор Адорна, што даў яму характарыстыку «ідэалагічных куліс», каб прыхаваць сапраўднае зло, і Эрыха Фрома, які параўнаў спорт з опіумам, што дазваляе пазбегнуць сацыяльнай рэальнасці.

Падставы філасофіі алімпізму, якія базіраваліся на прынцыпах гарманічнага развіцця чалавечай асобы, святога міру, сумленнай і высакароднай барацьбы на спартыўных спаборніцтвах, сутыкнуліся з уяўнай пагрозай дэгуманізацыі ў перыяд 1970–1980 гг. Гэта быў крызісны момант у функцыянаванні сусветнага алімпійскага руху. Міжнароднае супольніцтва яшчэ не да канца аправілася ад наступстваў «халоднай вайны», як пачалі адбывацца іншыя негатыўныя з’явы планетарнага характару, што паставіла пад удар нават існаванне самога Міжнароднага алімпійскага камітэта. Безумоўна, на пачатку трэба нагадаць пра тую трагедыю, якая адбылася падчас правядзення XX летніх Алімпійскіх гульняў 1972 г. у Мюнхене. У ноч з 4 на 5 верасня на тэрыторыю Алімпійскай вёскі пранікла васьмёра тэрарыстаў з палесцінскай арганізацыі «Чорны верасень», якія прабраліся ў распалажэнне ізраільскай дэлегацыі. У выніку гэтай смяротнай акцыі ахвярамі сталі 11 членаў каманды Ізраіля. Рэзананс быў настолькі моцным, што ўпершыню з моманту адраджэння Алімпіяд гульні былі перапынены. Прэзідэнт МАК Эйвэры Брандыдж і члены Арганізацыйнага камітэта спаборніцтваў былі ў роспачы. Нямецкі бок на чале са старшынёй Арганізацыйнага камітэта Вілі Даўмэ настойваў на тым, каб адмяніць усе спаборніцтвы, але па заканчэнні нярвовай дыскусіі Эйвэры Брандыдж і яго прыхільнікі ўзялі верх: пасля аднадзённага перапынку Гульні аднавіліся. Пазней

словы тагачаснага кіраўніка МАК былі растыражаваныя шматлікімі сродкамі масавай інфармацыі: «Гульні павінны працягвацца, і мы павінны прыкладаць нашы намаганні, каб Гульні заставаліся чыстымі, бездакорнымі і сумленнымі» [1]. Нягледзячы на тое, што ўрад і Алімпійскі камітэт Ізраіля падтрымалі гэтае рашэнне, філасофскія падставы алімпізму прынцыпова былі праігнараваны. На Алімпійскім стадыёне была праведзеная памінальная служба ў прысутнасці 80 тыс. чалавек і 3 тыс. атлетаў. На ёй знаходзіліся прадстаўнікі ўсіх краінаў, акрамя дзесяці арабскіх дзяржаваў і СССР. Прэзідэнт МАК Эйвэры Брандыдж выступіў з прамовай, якая, праўда, да канца так і не вызначыла актуальных аспектаў сучаснага алімпійскага руху і не акцэнтавала ўвагі на магчымых пагрозах у будучым.

Летнія Алімпійскія гульні 1972 г. у Мюнхене яскрава прадэманстравалі новую сацыякультурную сітуацыю, якая ўтварылася ў сучасным свеце. Апартэід, тэрарызм, ксенафобія, неталерантнасць у сістэме сацыяльных зносінаў зрабіліся звычайнымі з’явамі, якія знайшлі сваё распаўсюджванне ў галіне спорту, адлюстроўваючы navakolьную рэчаіснасць. Менавіта ў гэты час адбылася змена вышэйшага кіраўніцтва ў Міжнародным алімпійскім камітэце.

Новай галоўнай постаццю ў іерархіі гэтай арганізацыі стаў ірландзец Майкл Морыс лорд Кіланін, чарговы прадстаўнік з арыстакратычнага роду на чале МАК пасля французскага барона П’ера дэ Кубертэна і бельгійскага графа Анры дэ Байле-Лятура. Выбары адбыліся на 73-й сесіі МАК у Мюнхене 21 жніўня 1972 г. Акрамя лорда Кіланіна на гэты пост прэтэндаваў прадстаўнік Францыі граф Жан дэ Бамон. Па выніках галасавання за лорда Кіланіна было аддадзена 39 галасоў, за ягонага канкурэнта – 19.

Майкл Морыс лорд Кіланін (1914–1999) нарадзіўся ў Лондане праз некалькі дзён пасля пачатку Першай сусветнай вайны ў сям’і ірландца і аўстралійкі. Пасля смерці бацькі Джорджа Морыса на фронце праз некаторы час ягоная маці выйшла замуж за Джерарда Тарпа, які быў матэрыяльна добра забяспечаным чалавекам. Дзякуючы гэтаму Майкл Морыс атрымаў выдатную адукацыю: паслядоўна вучыўся ў Ітан-коледжы, Сарбоне і Магдалінскім коледжы ў Кембрыджы. У 1927 г., калі памёр ягоны дзядзька, ён прыняў тытул лорда Кіланіна.

Па заканчэнні вучобы ў 1935 г. Майкл Морыс спецыялізаваўся ў журналістыцы: працаваў на такія выданні, як «Daily Express», «Daily Mail» і «Sunday Dispatch», а ў 1937–1938 гг. быў ваенным карэспандэнтам у Кітаі. Сярод ягоных асабістых захапленняў пераважалі бокс, веславанне, рэгбі і конны спорт. Затым ён дабраахвотна ідзе на службу ў брытанскую армію, у званні маёра брыгады прымае чынны ўдзел у аперацыі ў Нармандыі, за што быў адзначаны ордэнам Брытанскай імперыі. Пасля дэмабілізацыі ў 1945 г. ён ажаніўся з Шэйлай Мэры Данлап. У пары нарадзілася чацвёра дзяцей: тры сыны і дачка.

Пасляваенная кар’ера лорда Кіланіна развівалася вельмі імкліва. Ён займаў пасады кіраўніка ў шэрагу ірландскіх кампаній, узначальваў некалькі культурна-спартыўных таварыстваў, акрамя таго ўдзельнічаў у стварэнні некалькіх мастацкіх фільмаў. Яму ж належаць шэраг публіцыстычных работ і аўтабіяграфія пад назвай «Мае алімпійскія гады».

Непасрэдна праца лорда Кіланіна ў алімпійскім руху пачалася ў 1950 г., калі ён быў прызначаны на пасаду прэзідэнта Ірландскага алімпійскага камітэта, які ўзначальваў да 1973 г. У 1952 г. яго абралі членам Міжнароднага алімпійскага камітэта, а ў 1968 г. ён становіцца яго віцэ-прэзідэнтам. Высокі ўзровень адукацыі, дыпламатызм, здольнасць вырашаць пытанні шляхам перамоў не маглі не застацца без увагі, калі надыйшоў час выбараў новага прэзідэнта МАК. Восем гадоў кіравання, якія прыпалі на тэрмін прэзідэнтуры лорда Кіланіна, шмат у якіх навуковых і публіцыстычных матэрыялах характарызуюцца як складаны, крытычны і крызісны час [2]. Толькі кароткі пералік праб-

лем, што напаткаў МАК у той перыяд, дэманструе, наколькі няпроста было праводзіць міжнародную дзейнасць на падставе прынцыпаў Алімпійскай хартыі. Наступствы тэрарыстычнай акцыі 1972 г. у Мюнхене пацягнулі за сабой фінансавы правал Алімпіяды 1976 г. у Манрэалі, да гэтага ж трэба дадаць байкот тых жа самых манрэальскіх Гульняў і надыходзячай летняй Алімпіяды ў Маскве 1980 г. Насуперак прынцыпам і правілам МАК у безальтэрнатыўым парадку былі зацверджаны адзіныя кандыдаты на правядзенне зімовых Алімпійскіх гульняў 1980 г. і летніх Алімпійскіх гульняў 1984 г. – Лэйк-Плэсід (ЗША) і Лос-Анджэлес (ЗША).

Мэта працы – на падставе інтэрпрэтацыі найбольш вядомых фактаў, якія характарызуюць дзейнасць кіраўніцтва Міжнароднага алімпійскага камітэта і асабіста прэзідэнта МАК Майкла Морыса лорда Кіланіна ў перыяд з 1972 па 1980 год прааналізаваць стратэгію і тактыку гэтай арганізацыі па захаванні галоўных прынцыпаў Алімпійскай хартыі, філасофіі алімпізму і алімпійскага руху ў сітуацыі палітычнага ціску і разгортвання новага вітка «халоднай вайны» паміж двума канфрантацыйнымі бакамі пад кіраўніцтвам супердзяржаў сучаснага свету СССР і ЗША.

У працэсе падрыхтоўкі дадзенага артыкула былі выкарыстаны такія метады даследавання, як апісанне, а таксама аналіз літаратурных і навуковых крыніц і інтэрнэт-рэсурсаў. Арганізацыя даследавання ажыццяўлялася шляхам збору інфармацыі аб дзейнасці шостага прэзідэнта МАК Майкла Морыса лорда Кіланіна.

З самага пачатку сваёй дзейнасці ў якасці лідара МАК лорд Кіланін сутыкнуўся з наступствамі супярэчлівых дзеянняў свайго папярэдніка. Асаблівыя складанасці ўтрымлівала ў сабе праблема наладжвання ўзаемных адносін паміж МАКам, міжнароднымі спартыўнымі федэрацыямі і нацыянальнымі алімпійскімі камітэтамі. Слабы давер і дрэнныя кантакты паміж гэтымі арганізацыямі ў перыяд кіраўніцтва Эйвэры Брандыджа давялі да шматлікіх непаразуменняў, і, каб пазбегнуць далейшага абвастрэння адносінаў у гэтай галіне, была створаная трохбаковая камісія, адной з галоўных задач якой было супрацьдзеянне росту тэндэнцыі ахаплення патранатам міжнароднага алімпійскага руху з боку UNESCO. Акрамя таго, былі зроблены адпаведныя лібералізацыйныя праўкі правіла 26 Алімпійскай хартыі, дзе акрэслівалася паняцце аматарства. Пазней МАК на сваёй 75-й сесіі 1974 г. у Вене зрабіў наступныя істотныя мадыфікацыі гэтага правіла. Яшчэ адным важным рашэннем сталася абмежаванне да 72 гадоў узросту членаў гэтай арганізацыі, і такім чынам быў скасаваны прынцып пажыццёвага членства. Пэўнай заслугай лорда Кіланіна з’яўляецца і тое, што з яго удзелам была заснавана Камісія салідарнасці, якая прадугледжвала высокі фінансавы бюджэт, што меўся быць прызначаны для развіцця спорту ў найбяднейшых рэгіёнах свету.

Перыяд прэзідэнцтва лорда Кіланіна з 1972 па 1980 г. суправаджаўся шэрагам крызісных акалічнасцей як адносна парушэнняў філасофскіх падстаў алімпізму і прынцыпаў Алімпійскай хартыі, так і адносна здарэнняў палітычнага характару. Выбары гаспадароў летніх і зімовых Алімпійскіх гульняў адбыліся ў 1970 г. Гэтыя правы атрымалі адпаведна Манрэаль (Канада) і Дэнвер (ЗША). Аднак улады Дэнвера праз два гады адмовіліся ад правядзення спаборніцтваў па фінансавых прычынах, а таксама праз тое, што жыхары горада на рэферэндуме выказаліся супраць арганізацыі Гульняў. Выканкам МАК апынуўся ў вельмі складаным становішчы, прымаліся надзвычайныя намаганні, каб знайсці новага гаспадара Алімпіяды. На шчасце, зімовыя спаборніцтвы пагадзіўся прыняць аўстрыйскі Інсбрук. Складанасці ў адносінах арганізацыі Гульняў у Манрэалі мелі крыху іншы характар, але арганізатары таксама сутыкнуліся з фінансавымі праблемамі. Выратаванне прыйшло дзякуючы, галоўным чынам, паспяховым намаганням дзвюх асоб, а менавіта Артура Такача, які быў дарадцам Арганізацыйнага камітэта, і Віктара Голдблума, міністра камунальных спраў канадскай правінцыі Квебек.

Здавалася, што далей не будзе ніякіх перашкод для паспяховага правядзення Гульняў. Аднак прэзідэнт і члены выканкама МАК сутыкнуліся з новымі палітычнымі рэаліямі, якія ішлі насуперак прынцыпам Алімпійскай хартыі. Найперш узніклі спрэчкі адносна ўдзелу ў спаборніцтвах дэлегацый Кітайскай Народнай Рэспублікі і Тайваня. Кітайскі бок не пагаджаўся ні на якія кампрамісы і ўсяляк дамагаўся таго, каб Тайвань не быў дапушчаны да ўдзелу. Другім складаным пытаннем для арганізатараў з’яўлялася пагроза байкоту Гульняў з боку прадстаўнікоў шэрагу афрыканскіх краін. Трэба заўважыць, што гэтыя праблемы не ўзніклі зусім нечакана, яны доўжыліся ўжо не адзін год, але папярэдні склад МАК не здолеў іх вырашыць, а напярэдадні спаборніцтваў у Манрэалі яны практычна ператварыліся ў адкрыты канфлікт.

Кіраўніцтва МАК апынулася ў складаным становішчы, калі ўлады Канады пад дыпламатычным націскам КНР адмовіліся прыняць дэлегацыю Тайваня. Гэтае рашэнне з боку краіны – гаспадара Алімпійскіх гульняў парушала не толькі ранейшыя ўрадавыя гарантыі адносна правядзення Гульняў, больш за тое, яны парушалі фундаментальныя прынцыпы Алімпійскай хартыі, якая не дапускала ніякай формы дыскрымінацыі для атлетаў. Падставы філасофіі алімпізму, што былі распрацаваныя П’ерам дэ Кубертэнам, сутыкнуліся з жорсткай палітычнай рэчаіснасцю [3, с. 129–131]. Лорд Кіланін асабіста спрабаваў знайсці аптымальнае рашэнне, каб згладзіць напружаную сітуацыю, але нават ён на перамовах з прэм’ер-міністрам Канады П’ерам Трудо не змог дасягнуць поўнай згоды ў гэтым пытанні. У выніку Нацыянальны алімпійскі камітэт Тайваня катэгарычна адмовіўся ад прапаноў лорда Кіланіна і П’ера Трудо і дэлегацыя гэтай краіны не ўзяла ўдзел у Гульнях.

Другой сур’ёзнай праблемай для МАК стала пагроза чарговага байкоту Гульняў у Манрэалі з боку шэрагу афрыканскіх дзяржаў. Па вялікім рахунку, як падкрэслівае Мат Бэрсэл, спартыўныя байкоты з’яўляюцца формай неагрэсіўнага і негвалтоўнага пратэсту і ў якасці «палітычнай зброі» выкарыстоўваюцца для ціску на нацыянальны маральны дух той ці іншай краіны, каб пазбавіць яе магчымасці ўдзелу ў міжнародных спаборніцтвах [4, с. 7–8]. Выкарыстанне пагрозы байкоту было выпрабавана на папярэдняй Алімпіядзе ў Мюнхене. Як вядома, тады ад алімпійскага руху былі адлучаныя каманды Паўднёва-Афрыканскай Рэспублікі і Радэзіі з-за сваёй палітыкі апартэіду. Зараз прадстаўнікі Афрыкі паспрабавалі націснуць на МАК з тым, каб да спаборніцтваў не былі дапушчаныя таксама і тыя краіны, якія падтрымлівалі з імі спартыўныя кантакты. Спрэчкі разгарнуліся на падставе факта турнэ рэгбістаў Новай Зеландыі ў Паўднёвай Афрыцы. Лорд Кіланін аргументавана адказаў на гэта: па-першае, рэгбі не з’яўляецца алімпійскай дысцыплінай, а, па-другое, спартыўныя кантакты з ПАР падтрымліваюць яшчэ больш за дваццаць іншых краін. З іншага боку, калі справа тычыцца матчаў таварыскіх альбо серыі сустрэч у гэтай дысцыпліне, МАК папросту не мае магчымасцяў паўплываць на такое стаўленне з юрыдычнага пункту гледжання. Сакратар Вышэйшага савета па справах спорту ў Афрыцы Жан Клод Ганга звяртаўся да новазеландцаў з просьбай, каб тыя перарвалі турнэ сваёй дружыны ў Паўднёва-Афрыканскай Рэспубліцы, але быў інфармаваны пра тое, што алімпійская дэлегацыя Новай Зеландыі і ўрад краіны не маюць кантролю над камандай «All Blacks», кіраўніцтва якой самастойна прымала рашэнне адносна правядзення спарынгаў. Не змог ён таксама атрымаць падтрымкі з боку МАК і НАК Новай Зеландыі ў справе сумеснага асуджэння палітыкі апартэіду і турнэ рэгбійнай зборнай Новай Зеландыі. Абодва бакі спасылаліся на тое, што рэгбі не з’яўляецца алімпійскім відам спорту.

Першымі ад удзелу ў XXI летніх Алімпійскіх гульнях у Манрэалі адмовіліся Нігерыя і Танзанія, а пасля цырымоніі адкрыцця да іх далучыліся іншыя (галоўным чынам афрыканскія) краіны. Акрамя таго, салідарнасць з імі прадэманстравалі Ірак з Азіі і Гаяна з Паўднёвай Амерыкі. У суме Алімпійскія гульні байкатавалі 22 афрыканскія

дзяржавы, і гэта на той момант быў колькасна самы вялікі байкот спартыўных спаборніцтваў, а ўвогуле першы з трох самых вялікіх спартыўных байкотаў сучаснасці. Усе яны адгукнуліся на заклік Арганізацыі Афрыканскага адзінства, якая з гэтай прычыны падрыхтавала спецыяльную рэзалюцыю [5, с. 223].

Але тым разам кіраўніцтва МАК на чале з прэзідэнтам занялі жорсткую пазіцыю адносна дзейнняў прадстаўнікоў афрыканскіх краін. Лорд Кіланін, які знешне выглядаў як асоба, што ўсяляк пазбягае вострай канфрантацыі, рашуча выступіў супраць гэтай скаардынаванай акцыі і акцэнтавана звярнуў увагу на прынцыпы Алімпійскай хартыі. Такая пазіцыя, здаецца, прадэманстравала, што, з аднаго боку, МАК па-ранейшаму будзе прытрымлівацца галоўных пастулатаў філасофіі алімпізму, а з другога – паказала, што Міжнародны алімпійскі камітэт з'яўляецца арганізацыяй адкрытага тыпу, якая акцэптуе разнастайныя формы дыялогу.

Апошняя заўвага сталася як мага дарэчы. Набліжаўся 1980 год, а гэта значыць, час XXII летніх Алімпійскіх гульняў у Маскве. Пасля «пацяплення» міжнароднага палітычнага клімату і разрадкі напружанасці на пачатку 70-х гг. мінулага стагоддзя стала здавацца, што далейшыя працэсы паляпшэння адносінаў паміж дзяржавамі свету будуць працягвацца, у тым ліку і ў спорце. Пад уплывам усяго гэтага на 75-й сесіі МАК 1974 г. у Вене месцам правядзення чарговай Алімпіяды была выбрана Масква. Пасля арганізацыйных і фінансавых правалаў з Дэнверам і Манрэалем кіраўніцтва МАК і асабіста яго прэзідэнт вельмі ўважліва шукалі наступнага прэтэндэнта, але на гэты раз з высокай ступенню дакладнасці спрабавалі заручыцца падтрымкай урада краіны. Масква падыходзіла па шэрагу крытэрыяў: тут была адпаведная спартыўная інфраструктура, а ўлады СССР праз арганізацыю Алімпіяды вырашалі свае прапагандыцкія задачы. Аднак галоўным было ўсё ж такі тое, што былі атрыманы дзяржаўныя гарантыі. Дарэчы, практыка правядзення міжнародных спартыўных спаборніцтваў вышэйшага ўзроўню неаднаразова дэманстравала прыклады таго, што іх арганізацыя найбольш складаная ў краінах «дэмакратычнага рэжыму», калі станоўчыя ці адмоўныя рашэнні прымаюцца шляхам галасавання жыхароў.

На жаль, напрыканцы 70-х гг. XX стагоддзя міжнародныя адносіны сталі пагаршацца, асабліва гэта тычылася дзвюх супердзяржаў – СССР і ЗША, якія сышліся ў барацьбе за сусветнае дамінаванне. Напруга паміж імі дасягнула апагею, калі ў часе і прасторы на фоне нафтавага крызісу выявіліся новыя непаразуменні: па рашэнні амерыканцаў у Еўропе былі размешчаны ракеты сярэдняга радыусу дзеяння. Байкот Гульняў у Манрэалі ў параўнанні з тымі падзеямі, якія разгарнуліся далей па лініі канфрантацыі СССР – ЗША, ужо не выглядаў такім небяспечным, як гэта здавалася раней. Незадоўга да старту маскоўскай Алімпіяды мелі месца яшчэ наступныя падзеі, якія ўскалыхнулі ўвесь свет. Падчас правядзення прэзідэнцкай перадвыбарнай кампаніі ў Злучаных Штатах Амерыкі савецкія войскі ў канцы снежня 1979 г. занялі Афганістан. Кандыдат на пасаду прэзідэнта ЗША Джымі Картэр скарыстаўся гэтай сітуацыяй, каб абвясціць новы віток «халоднай вайны» ў супрацьстаянні «заходняй дэмакратыі» з «камуністычным рэжымам». Адным са сродкаў ціску на Савецкі Саюз стала пагроза байкоту маскоўскай Алімпіяды, хоць першапачаткова паўсталі прапановы адкласці Гульні ці наогул перанесці іх у іншы горад. І на гэты раз лорд Кіланін захаваў мужнасць і цвёрда абвясціў тое, што тэрмін і месца правядзення спаборніцтваў не будуць зменены ні ў якім разе. Прэзідэнт МАК рашуча адстойваў прынцыпы Алімпійскай хартыі ў вельмі няпростай сітуацыі. Да таго ж ягонае стаўленне да гэтага пытання было рэзка кантрасным адносна некампетэнтных заяў прадстаўнікоў амерыканскай адміністрацыі. Канчаткова ўсё вырашылася падчас 82-й сесіі МАК, якая ў лютым 1980 г. праходзіла ў сталіцы XIII зімовых Алімпійскіх гульняў – амерыканскім горадзе Лэйк Плэсідзе. Менавіта тады на вышэйшым узроўні прэзідэнт МАК выказаўся пра недапушчальнасць таго, каб палі-

тыка перашкаджала развіццю алімпійскага руху, і далей падкрэсліў, што Алімпіяды не павінны выкарыстоўвацца як сродак падзелу свету, а атлетаў нельга змушаць да вырашэння праз іх палітычных праблемаў. Супрацьлеглую пазіцыю агучыў дзяржсакратар ЗША Сайрус Вэнс, які ад імя прэзідэнта краіны выказаўся за тое, каб па-збавіць Маскву права арганізацыі Гульняў, бо гэта несумяшчальна з духам алімпізму і ўваходзіць у супярэчнасць з адным з найбольш старажытных алімпійскіх прынцыпаў, а менавіта «прынцыпам святога міру». У дадзенай інтэрпрэтацыі Масква выступала як сталіца краіны-акупанта. Члены МАК негатыўна адрэагавалі на выступленне Сайруса Вэнса і затым адзінагалосна падтрымалі кандыдатуру Масквы ў справе арганізацыі XXII летніх Алімпійскіх гульняў 1980 г. [6, с. 61–62].

Рэзалюцыя адносна правядзення Алімпіяды ў Маскве была прадстаўленая лордам Кіланінам. У ёй сцвярджалася, што дамова аб правядзенні спаборніцтваў ад 23 кастрычніка 1974 г. застаецца ў сіле. Міжнародны алімпійскі камітэт яшчэ раз выказаўся за неабходнасць падтрымкі алімпійскіх прынцыпаў з тым, каб Алімпіяды адбываліся згодна з традыцыямі і ў як мага найлепшай атмасферы. Акрамя таго, было зазначана, што толькі нацыянальныя алімпійскія камітэты маюць права прымаць рашэнні ў справе прыняцця запрашэння да ўдзелу ў Гульнях. Такім чынам, яшчэ раз была акцэнтвана ўвага на ідэі прадстаўніцтва МАК у асобнай краіне праз нацыянальныя алімпійскія камітэты, а не прадстаўніцтва дзяржавы ў МАК. Іншымі словамі, дзяржава не павінна ўмешвацца ў дзейнасць Нацыянальнага алімпійскага камітэта [7, с. 99–113].

Падтрымка маскоўскай Алімпіяды членамі МАК зусім не азначала, што праблемная сітуацыя засталася вырашанай. Свет у чарговы раз быў падзелены на два канфрантацыйныя бакі. Амерыканская адміністрацыя распачала міжнародную кампанію байкоту па ўсіх магчымых накірунках, а Міжнародны алімпійскі камітэт і міжнародныя федэрацыі па відах спорту прыкладалі ўсялякія намаганні, каб Гульні адбыліся. Лорд Кіланін апынуўся ў вельмі складаным становішчы. Пагроза байкоту, які ўзначаліў амерыканскі бок, выглядала вельмі сур'ёзна, і ён быў падтрыманы большасцю парламентаў і ўрадаў саюзнікаў ЗША. Гэта была прамая пагроза ўсяму алімпійскаму руху. Міжнародныя спартыўныя арганізацыі, аднак, па большасці раздзялялі пазіцыю МАК. Лорд Кіланін рабіў адчайныя спробы, каб дасягнуць нейкіх кампрамісаў, але не змог дабіцца станоўчых вынікаў: не дапамаглі нават размовы з вышэйшымі кіраўнікамі СССР і ЗША – генеральным сакратаром Леанідам Брэжневым і прэзідэнтам Джымі Картэрам. У выніку міжнароднага байкоту маскоўскай Алімпіяды ўдзел у ёй прынялі дэлегацыі толькі 81 Нацыянальнага алімпійскага камітэта са 147 камітэтаў, якія на той момант былі прызнаныя МАК.

**Заключэнне**

Алімпізм як філасофская сістэма меў мэтай гарманічнае развіццё чалавека ў варунках мірнага супольніцтва, дзе б шанавалася людская годнасць. Варта мець на ўвазе, што алімпізм адназначна не заклікае да перамогі за ўсялякі кошт. Зразумела, перамога з'яўляецца найважнейшым вынікам кожнага спаборніцтва, але не заўсёды яна выступае як галоўны паказчык. Заняткі спортам – неад'емнае права кожнага чалавека, таму тут не можа быць ніякай дыскрымінацыі. Лорд Кіланін неаднаразова звяртаў на гэта ўвагу. Гульні павінны быць незалежнымі ад ціску з прычыны адрозненняў па колеры скуры, палавой прыналежнасці, рэлігійнага вызнання, палітыкі і г.д.

Непрадказальнасць глабальнай міжнароднай палітыкі, якая па вялікім рахунку падзяліла свет на два супрацьлеглыя бакі па крытэрыі сацыяльна-эканамічнай арыентацыі, прымусіла МАК і ягонага прэзідэнта ў вялікай ступені пераасэнсаваць шэраг падыходаў да развіцця і распаўсюджвання алімпійскага руху. Філасофскія падставы алімпізму былі падвергнутыя масавым нападкам з боку новай сацыяльнай рэчаіснасці. Імк-

лівыя змяненні палітычнага атачэння ўвасобіліся ў фарміраванні пачаткаў тэндэнцый дэмакратызацыі, лібералізацыі і гуманізацыі, што сталі дамінаваць у бліжэйшай ці больш аддаленай будучыні. Феномен спорту дзякуючы сваёй папулярнасці і шырокаму распаўсюджванню на цэлым свеце вельмі лёгка стаў пранікаць у іншыя сацыякультурныя структуры, што не магло застацца без увагі. Лорд Кіланін апынуўся ў сітуацыі, калі, з аднаго боку, неабходна было захаваць традыцыйныя алімпійскія каштоўнасці, што бралі свой пачатак ад часоў Старажытнай Грэцыі, а з другога – ён быў змушаны да хуткага прыняцця рашэнняў у варунках сучаснай сацыяльна-эканамічнай рэальнасці згодна з актуальнай палітычнай кан'юнктурай. Менавіта ён павінен быў абараняць галоўныя прынцыпы алімпізму, менавіта ён павінен быў супрацьстаяць наступствам трагічных падзей 1972 г., а таксама вытрымаць ціск з боку афрыканскіх дзяржаў у 1976 г. і пераадолець міжнародны байкот 1980 г. Пры ўсім пры гэтым Майкл Морыс дэманстраваў інтэлігентнасць, стрыманасць у выказваннях, паслядоўнасць дзеянняў, што ў шэрагу выпадкаў забяспечвала яму поспехі ў вырашэнні спраў. Васьмігадовы тэрмін у якасці прэзідэнта Міжнароднага алімпійскага камітэта закончыўся ў 1980 г. у Маскве, дзе апошні раз лорд Кіланін выступіў з прамовай на 83-й сесіі МАК, у якой заклікаў да спартыўнага спаборніцтва згодна з алімпійскім духам, а таксама звярнуў увагу на негатыўныя вынікі ўмяшальніцтва палітыкі ў спорт [8].

Лорд Кіланін не стаў балаціравацца на наступны тэрмін у кіраўніцтве. Члены МАК у прызнанне ягоных заслуг у дзейнасці на карысць развіцця і далейшага распаўсюджвання ідэалаў алімпізму абралі яго пажыццёвым ганаровым прэзідэнтам, ён таксама быў узнагароджаны залатым Алімпійскім ордэнам. Пайшоў з жыцця Кіланін у 1999 г. ва ўзросце 84 гадоў. Пахаваны на сямейных могілках у горадзе Галуэй у Ірландыі.

## СПІС ВЫКАРЫСТАНАЙ ЛІТАРАТУРЫ

1. 'Games must go on', says Brundage [Electronic resource]. – Mode of access: https://www.stripes.com/news/games-must-go-on-says-brundage-1.36208. – Date of access: 11.03.2019.

2. Президенты МОК и их вклад в становление и развитие олимпийского движения [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://studopedia.ru/2_32870_prezidenti-mok-i-ih-vklad-v-stanovle-niei-raz-vitie.html. – Дата доступа: 02.04.2017.

3. Люкевич, В. Романтизм и сентиментализм fair play в прагматическом обществе : материалы II Междунар. форума «Молодежь – Наука – Олимпизм» / В. Люкевич. – М., 2002. – С. 129–131.

4. Bersell, M. Sports, Race, and Politics: The Olympic Boycott of Apartheid Sport [Electronic resource] / M. Bersell // Western Illinois Historical Review – 2017. – Vol. VIII. – 31 p. – Mode of access: http://www.wiu.edu/cas/history/wihr/pdfs/wihr-sports-race-politics-olympic%20boycott.pdf. – Date of access: 21.03.2019.

5. Kobierecki, M. Sportowa wojna światowa. Implikacje polityczne międzynarodowej rywalizacji sportowej w okresie zimnej wojny / M. Kobierecki. – Łódź : Ibidem, 2017. – 326 s.

6. Słoniewski, M. Wpływ przewodniczących Międzynarodowego Komitetu Olimpijskiego na przemiany w międzynarodowym ruchu olimpijskim po II wojnie światowej / M. Słoniewski // Pr. nauk. Akad. im. Jana Długosza w Częstochowie. – 2017. – T. XVI, № 1. – S. 47–74.

7. Matras, T. Bojkot igrzysk olimpijskich w Moskwie w 1980 r. przykładem wykorzystania sportu w celach politycznych w świetle wybranych żródeł drukowanych / T. Matras // Pr. nauk. Akad. im. Jana Długosza w Częstochowie. Ser. Kultura Fizyczna. – 2011. – S. 99–113.

8. Zimna wojna kradnie olimpijskie ideały. Igrzyska w Moskwie w 1980 r. [Zasób elektroniczny]. – Tryb dostępu: https://historia.org.pl/2016/07/11/zimna-wojna-kradnie-olimpijskie-idealy-igrzyska-w-moskwie-w-1980-r/. – Data dostępu: 15.02.2019.

Рукапіс паступіў у рэдакцыю 22.03.2019

***Lukievich U.P.*** **Crisis of Philosophy of Olympism during 1972–1980 years: IOC President Michael Morris Lord Killanin as a Defender of Sports Ideals**

*Sports movement, which embodied in the competition of the Olympic Games, can definitely be interpreted on the basis of the philosophy of life, which in this context is referred as Olympism. The fundamental principles of Olympism are directly related to ethical problems. The philosophy of life in the interpretation of Olympism pays great attention to moral tenets that are common to every human person. The development and spread of the Olympic movement in the second half of the twentieth century has repeatedly come into conflict with a variety of socio-political circumstances. In spite of the fact that the leadership of the International Olympic Committee in every possible way emphasized its non-involvement in political influences, from time to time it had to take appropriate decisions in order to ease international tension. The foundations of the philosophy of Olympism were forced to undergo a test of strength. The idea of Olympic sports with the need remained alone with such social phenomena as apartheid, terrorism and boycott. The world community has become clearly divided into two confrontational blocs. The ambiguity of situation in its then viewed needed to led be to the corresponding the integrity according to provisions of the Olympic Charter. This process took place against the backdrop of a total confrontation between the two strongest superpowers – the USSR and the USA.*